НОВАЯ КНІГАРНЯ Ў СТАЛІЦЫ 3

ЛІТВА Ў ПАСТЦЫ ІНФЛЯЦЫІ 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

16 ЧЭРВЕНЯ 2022 г. ЧАЦВЕР

№ 116 (29738)

ЗВЯЗДА

Векапомнае

ЗАХАВАЦЬ ГІСТАРЫЧНУЮ ПРАЎДУ І ЗБЕРАГЧЫ МІР

Такі асноўны лейтматыў пленарнага пасяджэння міжнароднай парламенцкай канферэнцыі «Гістарычная памяць: Вялікая Перамога, здабытая адзінствам»

Фота Белта.

Як заявіў Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, адкрываючы пленарнае пасяджэнне, барацьба за гістарычную праўду з'яўляецца барацьбой за будучыню ўсяго свету. «Перапісванне гісторыі, вайна з помнікамі савецкім воінам-вызваліцелям — вельмі небяспечная тэндэнцыя, — падкрэсліў ён. — Гэтым заходнія палітыкі маладой генерацыі практычна расчышчаюць шлях да адраджэння нацысцкай ідэалогіі. І самае страшнае, што ў іх разуменні вайна з'яўляецца нечым адцягненым, звычайным і цалкам дапушчальным».

ВЯЛІКАЯ ПЕРАМОГА ЯК ЧАСТКА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭІ

Па словах спікера ніжняй палаты парламента, сведчаннем гэтаму выступаюць практыка шырокага выкарыстання інструментаў палітычнага ціску, эканамічных санкцый, пастаяннае нарошчванне свайго ваеннага патэнцыялу. «У гэтых умовах праўда аб злачынствах фашызму, у якіх няма тэрміну даўнасці, служыць сур'ёзнай перасцярогай чалавецтву, а захаванне памяці аб вялікім подзвігу савецкага народа набывае асабліва маральнае гучанне», — пераканаў Уладзімір Андрэйчанка.

Па яго словах, абарона гістарычнай праўды — вельмі няпростыя, шматпланавыя і шматаспектны працэс. «Супраць нас вядзецца мэтанакіраваная інфармацыйная вайна, дзе мы, на жаль, займалі пераважна абарончую пазіцыю, — заўважыў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Мы проста былі не гатовыя да таго, што хлусня будзе настолькі цынічная, факты перакручаны, а карнікі і здраднікі будуць выстаўляцца ў якасці нацыянальных герояў. Тыя, хто ненавідзіць Вялікую Перамогу, павінны ведаць: нас немагчыма выкрасліць з гісторыі. Мы — галоўныя нашчадкі пакалення пераможцаў! І, змагаючыся са спробамі перафарматаваць нашу гістарычную памяць, мы фактычна ўстаём у адзіны строй са сваімі бацькамі і дзядамі».

Прывітальнае слова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў адрас удзельнікаў міжпарламенцкай канферэнцыі агучыў **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА**. «Мы, нашчадкі пераможцаў, азербайджанцы і малдаване, беларусы і грузіны, армяне і казахі, украінцы і кіргізы, рускія і ўзбекі, таджыкі і туркмены, прадстаўнікі ўсіх нацыянальнасцяў неклалі адзінай краіны, адстаялі ў Вялікай Айчыннай вайне права на жыццё, свабоду і чалавечую годнасць, — паведамляецца ў прывітальным слове. — Сёння, калі ў шматлікіх заходніх краінах наша Перамога аб'яўлена па-за законам, масава разбураюцца помнікі вызваліцелям, героямі аб'яўляюцца забойцы і каты, мы бяром на сябе абавязацельства абараняць гістарычную памяць аб самаахвярнай барацьбе савецкага народа з германскімі нацыстамі, якая забрала жыцці мільёнаў нашых суайчыннікаў». Кіраўнік дзяржавы пераканаў, што «разам мы захаваем агульнае гераічнае мінулае, не дазволім забрацьу нас Перамогу, здабытую адзінствам, бяспрыкладнай мужнасцю і крывёю салдат, партызан, падпольшчыкаў і многіх простых людзей, перададзім праўду будучым пакаленням».

Падчас свайго выступлення на пленарным пасяджэнні Ігар Сергеенка звярнуў увагу на тое, што ў аснову дзяржаўнай ідэалогіі беларусы паклалі ідэі пераемнасці пакаленняў, павагі да подзвігу пераможцаў, адказнасці перад народам і гісторыяй. «У Беларусі памяць аб агульнай перамозе — частка нацыянальнай ідэі, падмурак дзяржаўнасці і грамадзянскай згоды, — падкрэсліў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — У нашым грамадстве няма месца калабарацыянізму, праяўленням нацыяналізму і ксенафобіі».

СТАР. 2

Размова па сутнасці

Анатоль ІСАЧАНКА:

«ЗАРАЗ САМЫЯ СПРЫЯЛЬНЫЯ ЎМОВЫ РАЗВІЦЦЯ СЯРЭДНЯГА І МАЛОГА БІЗНЕСУ...»

Кіраўнік Магілёўскай вобласці пра работу ва ўмовах санкцый, уменне браць на сябе адказнасць і стаўку на буйнатаварную вытворчасць

Беларусь вучыцца працаваць у новых умовах. Санкцыі прымусілі памяняць партнёраў па бізнесе, пераарыентавацца на іншыя рынкі, але жыццё прынцыпова не змянілася. Заводы працуюць, грамадскі транспарт выязджае па графіку, дзеці адпачываюць у аздараўленчых лагерах. Цяжкасці ёсць, але нездарма кажуць, што дарогу адолее той, хто ідзе. Вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця Магілёўскай вобласці паказваюць, што сітуацыя застаецца стабільнай і кіраванай. У размове з журналістамі старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Ісачанка расказаў, як сёння вырашаюцца складаныя пытанні, на што робяцца стаўкі, што ў планах на найбліжэйшы перыяд. Загадзя падрыхтаваныя пытанні адразу ж адклалі ўбок. Губернатар прапанаваў правесці размову ў выглядзе сяброўскай гутаркі.

СТАР. 3

Памяць, памножаная на пяць

У братоў МАРОЗАЎ — Міхаіла, Аляксея, Мікалая, Сяргея і малодшага Пятра *(на фота яны сядзяць па ўзросце)*, якія нарадзіліся ў вёсцы Сенькаўшчына Бешанковіцкага раёна, традыцыя збірацца ў бацькоўскім доме напярэдадні Тройцы, успамінаць продкаў, наведаць могілкі, як кажуць, пакланіцца бацькам, дапамагчы па гаспадарцы.

Цяпер старэйшы Міхаіл і малодшы Пятро жывуць у вёсцы Слабодка (у Сенькаўшчыне, на жаль, ужо няма жыхароў), але да іх па-ранейшаму, як дадому, прыязджаюць іншыя браты — з Полацка, з Новалукомля, з суседняй вёскі Янаўшчына. У братоў асабістая памяць, яны ганарацца сваімі бацькамі — простымі сялянамі. Іх бацька Фёдар Міхеевіч Мароз быў ветэранам вайны, у 1942 годзе стаў партызанам у Полацка-Лепельскай партызанскай зоне, ваяваў у брыгадзе «За Савецкую Беларусь». І хоць бацька пайшоў з жыцця больш за дзесяць гадоў таму, у шафе малодшага брата па-ранейшаму вісіць яго салдацкі кіцель з медалямі і ордэнам — як напамін пра жудасную і гераічную старонку жыцця Радзімы.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Разумныя грошы

Калі рублі будуць умацоўвацца і далей, дэпазіты па іх стануць звышпрыбытковымі

Пытанне, куды ўкласці грошы, актуальнае і ў спакойныя, і ў крызісныя перыяды. Мы падабралі самыя значныя змены, якія адбываліся на банкаўскім рынку апошнім часам

Для пачатку нагадаем правілы выгаднага інвеставання: ніколі не ўкладвайце крэдытныя сродкі; распараджайцеся свабоднымі грашыма (фінансы, неабходныя для аплаты навучання, лячэння і іншых абавязковых выдаткаў чапаць нельга); ацэньвайце не толькі даходнасць, але і рызыкі (не варта спадзявацца, што менавіта вы станеце тым шчасліўцам, які пры 90 % рызыцы страціць укладанні ўсё-ткі сарве куш); падзялярыце рызыкі (па-навуковаму гэта называецца «дывер-сіфікацыя», а па-простаму «не захоўваць усе яйкі ў адным кошыку»). Нават самыя надзейныя інструменты маюць міззэрную, але верагоднасць правалу. Крыўдна будзе страціць усё, калі вам радыкальна не пашанцуе.

На ўкладах у беларускіх рублях сёння можна рэальна зарабіць: многія нашы банкі прапанавалі ўражлівыя працэнтныя стаўкі гадавых. Цяпер, калі наш і расійскі рублі працягваюць умацоўвацца, некаторыя фінансавыя інстытуты нават спецыяльна зніжаюць даходнасць рублёвых укладаў.

Але ўсё роўна на дадзеным этапе дэпазіты ў нацыянальнай валюце лічацца самымі выгаднымі ўкладаннямі.

СТАР. 3

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Папа Рымскі заявіў аб пачатку трэцяй сусветнай вайны

Кіраўнік Рымска-каталіцкай царквы Францыск бачыць у падзеях, якія разгортваюцца на планеце, пачатак чарговай вайны ў сусветных маштабах. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на італьянскую газету La Stampa. «Некалькі гадоў таму мне прыйшло ў галаву сказаць, што мы пражываем трэцюю сусветную вайну па частках. Сёння, я лічу, была аб'яўлена трэцяя сусветная вайна», — заявіў Папа Рымскі. Такім чынам, паводле яго слоў, за мінулыя сто гадоў чалавецтва перажывае ўжо трэцюю па ліку вайну ў глабальных маштабах. Такое развіццё сітуацыі пантыфік ахарактарызаваў як бедства і заклікаў задумацца над гэтым. Папа Рымскі таксама адзначыў, што сёння канфлікты ўспыхваюць па ўсім свеце. Мы ведаем пра падзеі ва Украіне, аднак пра тое, што адбываецца, напрыклад, у афрыканскіх краінах, ніхто не гаворыць і нікому да гэтага няма справы, сказаў пантыфік.

Улады Шатландыі плануюць правесці яшчэ адзін рэферэндум аб незалежнасці

Першы міністр Шатландыі Нікола Стэрджэн заявіла аб намеры правесці яшчэ адзін рэферэндум аб незалежнасці краіны ў наступным годзе, нават калі не атрымае на гэта адабрэнне парламента Вялікабрытаніі, паведаміла The Guardian. Яна заявіла, што раскажа аб сваіх планах парламенту Шатландыі «найбліжэйшым часам». Стэрджэн паведаміла, што яе ўрад распрацаваў юрыдычна бяспечны альтэрнатыўны спосаб правядзення рэферэндуму: на выпадак, калі брытанскія ўлады не санкцыянуюць правядзенне галасавання.

«У паўсядзённым жыцці людзі па ўсёй Шатландыі пакутуюць ад наступстваў узросліх расходаў на жыллё, нізкіх тэмпаў росту і няроўнасці, абмежаванага дзяржаўнага фінансавання і многіх наступстваў брэксіту, за які мы не галасавалі», — заявіла Стэрджэн, адзначыўшы, што прыйшоў час задацца пытаннем: ці застанецца Шатландыя «прывязаной да эканамічнай мадэлі Вялікабрытаніі» альбо «возьме за аснову курс на еўрапейскія краіны» і паспрабуе выйсці са складу каралеўства. Пры гэтым прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Борыс Джонсан днямі заявіў, што «народ Шатландыі прыняў рашэнне ўсяго некалькі гадоў назад», і таму пытанне аб незалежнасці варта лічыць закрытым.

Японскія фермеры пераключаюцца з рысу на пшаніцу



Сельгасвытворцы ў Японіі плануюць перапрафіляваць свае гаспадаркі і пачаць вырошчваць пшаніцу замест рысу. Як адзначыла газета Japan Today, аб гэтым сведчаць вынікі апытання, якое праводзіцца міністэрствам сельскай, лясной і рыбнай гаспадаркі. Да такога рашэння аграрыяў падштурхоўвае рост цэн на зерне, які адбыўся з-за канфлікту ва Украіне. Паводле даных на канец красавіка, 37 з 47 прэфектур Японіі заявілі, што яны скарацяць пасяўныя плошчы для вырошчвання рысу ў параўнанні з мінулым годам. Паводле ацэнак спецыялістаў, агульная плошча палеткаў, прызначаных для вырошчвання кулінарнага рысу ў Японіі, паменшыцца на 35 тысяч гектараў. У аграрным ведамстве адзначаюць, што попыт на пшаніцу з Японіі ўжо высокі. На сёння 80 працэнтаў гэтай сельгаскультуры ў краіне імпартуецца. Кошт дадзенага тавару ўзрастае. А вось спажыванне і кошт рысу ў Японіі маюць тэндэнцыю да зніжэння.

КАРОТКА

- Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб рэалізацыі калійных угнаенняў. Дакумент накіраваны на пашырэнне відаў валют, у якіх можа выплачвацца вывазная мытная пошліна на калійныя ўгнаенні.
- **Гандлёвыя сеткі працягваюць даваць зніжку 10 працэнтаў на сацыяльна значныя тавары для ўразлівых катэгорый насельніцтва.**
- РЧ аб'явілі аб арганізацыі круізных цягнікоў у Беларусь.
- **Кабінет камп'ютарнай тамаграфіі адкрылі ў паліклініцы № 1 Маладзечна.**
- Грузія адмяняе ўсе каранавірусныя абмежаванні для турыстаў з 15 чэрвеня.
- **Конкурс для педагогаў «Прававая майстэрня» стартаваў у Беларусі.**

Бывайце здаровы!

ГАЮЧАЯ КОНСКАЯ СІЛА

Каму і ў чым можа дапамагчы іпатэрапія?

Кожную раніцу залаціста-рудая Люся пачынае свой доўгі шлях, і на працягу працоўнага дня ў яе літаральна няма вольнай хвіліны. Ступае Люся не спяшаючыся, акуратна ставіць капыты, выбіраючы дарогу параўней. Беражліва і плаўна калыша яна на сваёй спіне чалавека, якому патрэбны яе дапамога, клопат і добрая энергетыка. Люся ўсведамляе важнасць сваёй працы, бо яна — лекар і часам разам з інструктарам-рэабілітолагам Кацярынай КАНДРАЦЕНКАЙ здольная сапраўды тварыць цуды.

Такія, як Люся, у Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі коннага спорту і конегадоўлі (ды і ў любым іншым, дзе практыкуецца іпатэрапія) — на вагу золата. Тут дастаткова коней значна больш пародзістых і чыстакроўных — прыгожых, як статуі, і хуткіх, як вецер. Люся не можа пахваліцца ні прыгажосцю, ні хуткасцю. Яе задача — а бадай што і місія — у іншым. Яна ўмее дзяліцца сваім цяплом, дарыць сілу і здароўе. І Люся — у гэтым можна нават не сумнявацца! — ведае аб сваёй унікальнасці. Таму яна дазваляе малым гладзіць сябе і цалаваць у нос, чухаць касматыя вушкі, тузаць за грыву і за доўгі шаўкавісты хвост. Яе можна нават абняць за нагу — ніколі не падбрыкне.

— У Люсі я ўпэўнена, — кажа Кацярына.

СТАР. 8

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

ISSN 1990 - 763X

ЗАХАВАЦЬ ГІСТАРЫЧНУЮ ПРАЎДУ І ЗБЕРАГЧЫ МІР

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па словах Ігара Сергеенкі, сёння мы трымаем удар з боку заходніх краін не толькі ў палітычнай, эканамічнай і ваенных сферах, але і ў галіне гістарычнай памяці. «На нашых вачах гісторыю навукі, якая звязвае мінулае і сучаснасць, калектыўны Захад перапісвае ў інструмент фармявання палітычнай рэальнасці, — канстатаваў ён. — Становіцца важным не аб'ектыўнае адлюстраванне фактаў, а іх патэнцыял для сацыяльнага ўздзеяння. У Польшчы, Украіне, краінах Балтыі разгорнута інфраструктура так званых інстытутаў нацыянальнай памяці, дзейнасць якіх носіць яскрава выяўлены антыбеларускі, антырасійскі і ў цэлым антысавецкі характар. Заходнія ідэолагі даўно перайшлі ўсе магчымыя межы. Такога нахабнага, беспрынцыповага ціску, з якім мы сутыкнуліся, не было нават у самыя складаныя перыяды халоднай вайны».

ЯДНАННЕ ДЗЕЛЯ ПРАЎДЫ І ПАМЯЦІ

Як адзначыла падчас свайго выступлення на пленарным пасяджэнні канферэнцыі **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА**, відавочна, што толькі прававых механізмаў для захавання гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне недастаткова. Па яе меркаванні, неабходна сістэма паслядоўных рашэнняў, ключавымі з якіх з'яўляюцца замацаванне за нашай дзяржавай права інтэрпрэтаваць падзеі Вялікай Айчыннай вайны на падставе гістарычнай праўды, якую ведае беларускі народ, сумеснае распрацоўка дзяржавай разам з зацікаўленымі арганізацыямі адэкватных мер абароны тых падзей ад інфармацыйнага ціску і супрацьдзеянне фальсіфікацыям, а таксама фарміраванне кругу гістарычнай палітыкі на папулярызацыю ведаў аб гэтым перыядзе, давядзенне дасягнення гістарычнай навукі да шырокай аўдыторыі. Акрамя таго, на думку спікера, разам мы павінны дамагацца прызнання і асуджэння на міжнародным узроўні генацыду беларускага народа.

— Асабліва хацелася б дастукацца да кожнага маладога чалавека, каб цанілі мір і памяталі, што перажылі нашы дзяды і прадзеды, у якіх нечалавечных умовах праходзілі іх дзяцінства і маладосць, — заўважыла Наталля Качанава. — Вынікам выбудаванай дзяржавай гістарычнай палітыкі ў адносінах да памяці аб Вялікай Перамозе павінна стаць асэнсаванае ўспрыманне беларускім грамадствам гэтага перыяду гісторыі. Стратэгічная задача — яднанне і сталенне беларускай нацыі шляхам выбудоўвання збалансаванай сістэмы каштоўнасцяў на аснове непахіснасці суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці беларускай дзяржавы.

На словах спікера верхняя палаты парламента, тыя, хто спрабуе сцерці нашу памяць, навязаць нам чужыя ідэалагемы і каштоўнасці, заслугоўваюць самай сур'ёзнай адказнасці. «Гэта здрадніцтва ў адносінах да тых людзей, якія загінулі ў імя Перамогі, у імя таго, каб сёння мы жылі ў міры і спакоі, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Мы не маем ніякага маральнага права гэтага дапусціць. Мы будзем захоўваць народную памяць і пісаць праўдзівую гісторыю сучаснай Беларусі».

Прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА звярнуў увагу на тое, што беларускі народ ніколі не перапісваў гісторыю, не пераўтвараў здраднікаў і катаў у герояў і аказваў. «Мы не зносілі помнікі, манументы і магілы воінаў, якія загінулі за свабоду Радзімы, — дадаў кіраўнік урада. — Для недапушчэння нават спроб скажэння вынікаў Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі афіцыйна прызнаны генацыд беларускага народа, здзейснены нацысцкімі злачынцамі і іх памагатымі ў ваенныя гады».

На перакананні Рамана Галоўчанкі, аб'яўлены Прэзідэнтам Год гістарычнай памяці з'яўляецца асаблівым для беларускай дзяржавы і дае магчымасць грамадству, асабліва моладзі, нанова ўсвядоміць тую цану, якую заплаціі беларусы за шматвяковае імкненне мірна жыць і працаваць на роднай зямлі. «На жаль, як паказваюць падзеі, трагічныя ўрокі мінулага ігнаруюцца, — канстатаваў прэм'ер-міністр. — І чым далей мы аддаляемся ад падзей Вялікай Айчыннай вайны, тым больш узнікае небяспек. Планета распальваецца па-новаму, мноцыца новыя ачагі супрацьстаяння, сацыяльных і этнічных канфліктаў. І на гэтым фоне зноў прарастаюць зярняты нацызму. Іх новая праява — разбураныя помнікі воінам-вызваліцелям, гераізацыя нацысцкіх злачынцаў, фальсіфікацыя гістарычнай праўды».

У той жа час Раман Галоўчанка звярнуў увагу на тое, што для Беларусі заўсёды і ўзводзіць новыя манументы ў гонар загінулых герояў, у гонар Вялікай Перамогі не толькі традыцыя, але і духоўная патрэба. «Сярод высакародных нацыянальных пачуццяў самыя глыбокія і свяцыя для любога народа — патрыятычныя, — падкрэсліў ён. — Фарміраваць і падтрымліваць патрыятычныя якасці — адна з найважнейшых задач дзяржавы. Сапраўдны патрыятызм праяўляецца праз ідэйна-грамадзянскія адносіны чалавека да гістарычнага мінулага сваёй краіны і навакольнай рэчаіснасці».

Прэм'ер-міністр перакананы: знакавыя падзеі павінны не раз'ядноўваць, а аб'ядноўваць краіны і народы, звязаныя адным агульным гістарычным лёсам.

— У нашай краіне няма ні аднаго раёна, ні аднаго буйнога населенага пункта, дзе б масава не вынішчалася мірнае насельніцтва, у тым ліку ў гады Вялікай Айчыннай вайны, — заявіў генпракурор. — Гісторыя не ведала ні аднаго падобнага факта, калі генацыд цэлага народа ажыццяўляўся ў такіх маштабах і з такой лютасцю.

Міністр абароны Віктар ХРЭНІН, які таксама выступіў на канферэнцыі, канстатаваў, што адстойваць заваяванні, абумоўленыя Перамогай над фашызмам, даводзіцца ва ўмовах бесprэцэдэнтных спроб нават не перапісаць або фальсіфіцыраваць гісторыю, а ўвогуле адмяніць яе. «У маі 1945 года здавалася, што фашызм як абсалютнае зло знішчаны назаўсёды, — заўважыў кіраўнік абаронага ведамства. — Аднак сёння мы бачым, што фашызм не загінуў у бункеры пад імперскай канцылярыяй і не быў пакараны ў Нюрнбергу. Фашызм жывы, бо ў свеце ёсць палітычныя сілы, якія зацікаўленыя ў рэваншы».

— Пытанні, якія мы з вамі абмяркоўваем, вельмі важныя для ўсіх нас і для нашых нашчадкаў, — адзначыў **генеральны сакратар АДКБ Станіслаў ЗАСЬ**. — І важныя не толькі з духоўна-маральнага пункту гледжання, але і для глыбокага разумення найноўшай гісторыі сучаснай Еўропы, разумення некаторых палітычных рэальнасцяў нашых дзён.

Вялікай Перамогі, па яго словах, удалося дамагчыся дзякуючы намаганням усіх народаў, якія абʼядналіся ў антыгітлераўскую кааліцыю. «Цяпер мы жывём у няпросты час, — дадаў Станіслаў Зась. — Жыццё вылучае перад нашымі народамі новыя выклікі і нават пагрозы. Няма сумненняў, што кожная дзяржава справіцца з гэтымі праблемамі, але трэба памятаць гэты ўрок — разам мы сіла. Рэзалюцыя, прынятая на выніках міжнароднай канферэнцыі, кансалідуе адзіную пазіцыю ўсіх нашых дзяржаў, прадстаўленых на форуме».

РЭАГУЮЧЫ НА ВЫКЛІКІ І ПАГРОЗЫ

Ходам расследавання крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, узбудженай Генеральнай пракуратурай у красавіку мінулага года, падзялялі **генеральны пракурор Андрэй ШВЕД**. Пры гэтым кіраўнік ведамства заявіў, што Беларусь працягнуў час падвяргалася ўсім формам генацыду.

— У нашай краіне няма ні аднаго раёна, ні аднаго буйнога населенага пункта, дзе б масава не вынішчалася мірнае насельніцтва, у тым ліку ў гады Вялікай Айчыннай вайны, — заявіў генпракурор. — Гісторыя не ведала ні аднаго падобнага факта, калі генацыд цэлага народа ажыццяўляўся ў такіх маштабах і з такой лютасцю.

Міністр абароны Віктар ХРЭНІН, які таксама выступіў на канферэнцыі, канстатаваў, што адстойваць заваяванні, абумоўленыя Перамогай над фашызмам, даводзіцца ва ўмовах бесprэцэдэнтных спроб нават не перапісаць або фальсіфіцыраваць гісторыю, а ўвогуле адмяніць яе. «У маі 1945 года здавалася, што фашызм як абсалютнае зло знішчаны назаўсёды, — заўважыў кіраўнік абаронага ведамства. — Аднак сёння мы бачым, што фашызм не загінуў у бункеры пад імперскай канцылярыяй і не быў пакараны ў Нюрнбергу. Фашызм жывы, бо ў свеце ёсць палітычныя сілы, якія зацікаўленыя ў рэваншы».

— Пытанні, якія мы з вамі абмяркоўваем, вельмі важныя для ўсіх нас і для нашых нашчадкаў, — адзначыў **генеральны сакратар АДКБ Станіслаў ЗАСЬ**. — І важныя не толькі з духоўна-маральнага пункту гледжання, але і для глыбокага разумення найноўшай гісторыі сучаснай Еўропы, разумення некаторых палітычных рэальнасцяў нашых дзён.

Вялікай Перамогі, па яго словах, удалося дамагчыся дзякуючы намаганням усіх народаў, якія абʼядналіся ў антыгітлераўскую кааліцыю. «Цяпер мы жывём у няпросты час, — дадаў Станіслаў Зась. — Жыццё вылучае перад нашымі народамі новыя выклікі і нават пагрозы. Няма сумненняў, што кожная дзяржава справіцца з гэтымі праблемамі, але трэба памятаць гэты ўрок — разам мы сіла. Рэзалюцыя, прынятая на выніках міжнароднай канферэнцыі, кансалідуе адзіную пазіцыю ўсіх нашых дзяржаў, прадстаўленых на форуме».

МІР — ГАЛОЎНАЯ КАШТОЎНАСЦЬ

У канферэнцыі прынялі ўдзел парламенцкія дэлегацыі з Арменіі, Казахстана, Расійскай Федэрацыі, Таджыкістана і Узбекістана, прадстаўнікі інтэграцыйных структур СНД, АДКБ, Саюзнай дзяржавы, замежныя дыпламаты, міжнародная навуковая і экспертная супольнасці.

Многія з удзельнікаў канферэнцыі, якія прыехалі ў Беларусь з іншых краін, заўважылі, што невыпадкова гэтае важнае міжнароднае мерапрыемства праходзіць на тэрыторыі Беларусі — краіны, якая ў той вайне страціла кожнага трэцяга свайго жыхара. Вядома, уклад многіх, у першую чаргу постсавецкіх дзяржаў, у Вялікую Перамогу — несумненны. Змагаліся з нацыстамі і жыхары Казахстана.

На словах **прадстаўніка дзелегацыі з Казахстана Абая ТАСБУЛАТАВА**, са звыш 1,2 мільёна казахстанцаў, якія ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне, загінула палова. «Чатыры дывізіі, шэсць палкоў і брыгад удзельнічала ў вызваленні Беларусі, — расказаў член дэлегацыі з Казахстана. — Толькі ў абароне Брэсцкай крэпасці прымалі ўдзел каля сямі тысяч казахстанцаў, тысяча з іх загінулі. Няўжо можна гэта забыць? Нельга забыць і тое, што мой дзядзька загінуў тут, на зямлі беларускай. Наша задача — не сцерці з памяці гераізм нашых бацькоў і дзядоў. Самае галоўнае, каб больш не было вайны. Мы з гонарам павінны несці Сцяг Перамогі, здабыты крывёю нашых дзедаў».

Член Нацыянальнага сходу Рэспублікі Арменія Марына КАЗАРАН, якая падчас пленарнага пасяджэння расказала пра ўдзел армян у Вялікай Айчыннай вайне, у Беларусі — упершыню. Яна прызналася, што ўражана тым, на якім узроўні ў нашай краіне захоўваецца памяць аб тых падзеях. Асабліва эмацыянальна дэпутат успрыняла паездку ў Хатынь. «Я не магла сказаць слова, калі ўбачыла гэтыя коміны, даведалася, што там загінулі дзесяці, якія павінны былі сёння мець нашчадкаў, — падзялілася Марына Казаран. — Яны павінны былі жыць, стварацъ, і раптам нехта вырашыў іх забіць».

На яе словах, тэма, узнятая падчас канферэнцыі, надзвычай актуальная. «Арменія з'яўлялася адной з рэспублік Савецкага Саюза, нашы воіны змагаліся на ўсіх франтах, — расказала член армянскай дэлегацыі. — На тэрыторыі Беларусі загінула 30 тысяч нашых салдат. У Брэсцкай крэпасці змагалася прыкладна 500 армян. Падчас Вялікай Айчыннай вайны змагаўся за Радзіму і мой дзед. Я хацела б, каб людзі ўспаміналі аб тых жудасных днях, аб той трагедыі, якую перажыў савецкі народ, успаміналі і тады, каб не было больш такіх войн. Трэба змагацца за мір. Мяне ўразіла, як вы, беларусы, захоўваеце памяць аб Вялікай Айчыннай вайне. Я ўдзячная Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, бо, калі б ён ставіўся да гэтай тэмы неналежным чынам, не было б гэтага ўсяго».

Па мерканні **члена Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Ірыны ДАЎГАЛЫ**, кожнае грамадства мае свой шлях развіцця. «Як правіла, гэта два вялікія крэмені: эканамічны і духоўны, — удакладніла парламентарый. — І калі з эканамічным усё зразумела, то ў духоўным ёсць тры непарушныя кіты: веданне гісторыі, памяць і тое, чым будуць жыць наступныя пакаленні. Гэта значыць, што сёння гэта кансалідацыя грамадства. На мой погляд, усе ўдзельнікі канферэнцыі аб'ядналіся (няважна, якія яны прадстаўляюць народы: славянскія або не) адной памяццю і захаваннем гістарычнай праўды. Мы кажам не аб тым, што трэба пісаць гісторыю, каб дагадзіць кіруючым сёння колам. Мы кажам: дзесьці гісторыя горкая, але гэта рэальныя старонкі, і іх трэба захаваць, іх патрэбна расказаць нашым дзецям, бо сёння ўжо мы пішам гісторыю».

— У свой час я нават не думаў аб тым, што праз 81 год пасля пачатку вайны і праз 77 гадоў пасля Перамогі мы будзем адстойваць Перамогу, тых, хто завяваў для нас мір і спакойнае жыццё на нашай зямлі, усёй постсавецкай прасторы, — адзначыў **дырэктар Мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць — герой» Рыгор БЫСЮК**. — Але гэта знак таго, што мы павінны зноў згуртавацца: беларусы і рускія, армяне і азербайджанцы, казахі і іншыя, каб яшчэ раз задумацца, наколькі актуальная тэма нашых сувязяў паміж народамі. Згадаем нашу Брэсцкую крэпасць у 1941 годзе. Тады быў шматнацыянальны гарнізон, у які ўваходзілі прадстаўнікі амаль 30 нацыянальнасцяў, якія сустралі ворага на граніцы Савецкага Саюза. Многія з іх нават не ведалі рускай мовы, але згуртаваліся разам і паверылі, што нешта могуць зрабіць для сябе, сваіх сяброў, для ўсёй краіны. Яны гэта зрабілі: і пад Брэстам, і пад Мінскам, і пад Магілёвам, і пад Масквой, Севастопалем, Адэсай, Сталінградам... Бо былі разам. Сёння ў такі неспакойны час мы зноў аб гэтым гаворым. Але важна, каб тое, аб чым гаворыцца, дайшло да кожнага чалавека.

* * *

На выніках канферэнцыі была прынята рэзалюцыя. У ёй заклікаецца шанаваць памяць загінулых у барацьбе супраць нацызму, праяўляць пастаянны клопат аб захаванні і падтрыманні ў належным стане воінскіх пахаванняў, мемарыяльных комплексаў, помнікаў і абеліскаў, звязаных з падзеямі Другой сусветнай вайны. Дакументам асуджаюцца любое апраўданне нацысцкага руху, спробы рэабілітацыі і гераізацыі нацысцкіх злачынцаў, іх памагатых, непрымальнымі з'яўляюцца дзеянні па апагальванні месцаў памяці ахвяр Другой сусветнай вайны. Недапушчальныя і спробы фальсіфікацыі гісторыі і перагляд вынікаў вайны. Звяртаючыся да ўсіх народаў і парламентаў краін свету, сусветных арганізацый, удзельнікі канферэнцыі заклікаюць супрацьдзеянічаць дзейнасці па адраджэнні нацызму, рэабілітацыі і гераізацыі нацысцкіх злачынцаў і іх памагатых, апагальванні памяці ахвяр Другой сусветнай вайны. У сувязі з гэтым рэкамендуецца працягнуць выпрацоўку і прыняцце заканадаўчых і іншых мер, накіраваных на недапушчэнне рэабілітацыі нацызму, гераізацыі нацысцкіх злачынцаў і іх памагатых. Важна — захоўваць памяць аб Другой сусветнай вайне, выхоўваць падрастаючае пакаленне ў духу любові да Радзімы.

— Спасылаючыся на палажэнні Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, мы хочам нагадаць сусветнай супольнасці аб тым, што Рэспубліка Беларусь з'яўляецца сузаснавальніцай ААН, і стала яна сузаснавальніцай менавіта за ўклад у Перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне, за тыя пакуты, якія панёс беларускі народ, — акцэнтавала ўвагу **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Лілія АНАНІЧ**. — Мы хочам нагадаць усяму свету, сусветнай супольнасці, парламенцкім міжнародным структурам, парламентам краін Садружнасці і ад тым, што недапушчальна перапісваць гістарычную памяць, недапушчальна фальсіфікаваць гісторыю. На ўсіх міжнародных парламенцкіх пляцоўках мы сёння павінны перашкаджаць адраджэнню ідэй нацызму, апагальванню памятных месцаў, прыняцыю на міжнародным узроўні рашэнняў, якія ідуць уразрэз з гістарычнымі рашэннямі, калі ў Нюрнбергу былі асуджаны нацызм і нацысцкія злачынцы. І самае важнае ў рэзалюцыі: мы кажам аб тым, што трэба шырэй весці асветніцкую работу, прыцягваць да гэтай работы па гістарычнай памяці, патрыятычным выхаванні насельніцтва моладзь, грамадскасць, медыйныя структуры. Толькі так — разам, плячо ў плячо — мы зможам адстаяць памяць аб Вялікай Перамозе і стагоддзямі ўспаміну з гонарам несці Сцяг Вялікай Перамогі.

Як заўважаюць **першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ**, вельмі важна, што ў праекце рэзалюцыі мы зафіксавалі адносіны моладзі і функцыі грамадскага кантролю над захаваннем гістарычнай памяці. «Падчас профільнай секцыі мы з маладымі людзьмі абмеркавалі самыя перадавыя формы і практыкі, якія датычацца работы з моладдзю, уцягненне маладых людзей шматлікіх краін і вопыт работы ва ўзаемадзеянні з дзяржавамі маладзёжных аб'яднанняў, — паведаміў ён. — Такія практыкі існуюць у Рэспубліцы Беларусь, перш за ўсё я маю на ўвазе праекты Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. Вельмі важна, што не ўзнікае спрэчак на прадмет таго, што менавіта ў цяперашні гістарычны момант часу моладзі як ніколі неабходна выпрацоўваць агульную міждзяржаўную палітыку і падыходы да захавання гістарычнай аб'ектыўнай праўды. І, вядома, мы не можам спакойна назіраць за спробамі скажэння гістарычнай памяці. У гэтай сувязі ў праекце рэзалюцыі асобнымі пунктамі ўказана распаўсюдзіць рэакцыі на спробы дыскрэдытацыі нашай агульнай гісторыі».

Вераніка КАНЮТА.
Фота БелТА.

«Зрабіць усё, каб інфармацыйная прастора была запоўнена праўдзівай інфармацыяй»

У межах міжнародней парламенцкай «Гістарычная памяць: Вялікая Перамога, здабыта адзінствам», арганізаванай Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, на секцыі «Вялікая Перамога ў грамадска-медыйным дыскурсе» абмеркавалі дзяржаўную палітыку захавання гістарычнай памяці і супрацьдзеянне яе фальсіфікацыі ў кантэксце замацавання нацыянальнай бяспекі.

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Лілія АНАНІЧ звярнулася да заканадаўчага аспекту захавання гістарычнай памяці. У прыватнасці, да запатрабаванасці вопыту Беларусі ад недапушчэнні рэабілітацыі нацызму ў краінах СНД.

— Мы ўважліва прааналізавалі заканадаўства аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму краін АДКБ, СНД, і трэба сказаць, што сёння вопыт Беларусі можа быць запатрабаваны ў адпрацоўцы заканадаўства ў гэтым напрамку і ў іншых дзяржавах — удзельніцах Садружнасці. Таму што мы дакладна ў спецыяльным Законе «Аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму» не толькі далі паняцце, што такое нацызм і яго праявы, але і прапісалі цэлы шэраг вельмі важных пастулатаў, якія забяспечваюць рэалізацыю закона. Выразна замацаваны дзяржаўныя органы, якія займаюцца недапушчэннем рэабілітацыі нацызму. Дадзены азначэнні, што такое нацысцкая сімволіка і атрыбутыка. Таксама вядзецца работа, каб прадухіліць распаўсюджванне такога роду сімволікі, — сказала Лілія Ананіч.

Паводле яе слоў, павінна быць дакладнае заканадаўства, якое пастаянна адаптуецца. І гэта прапісана ў Канстытуцыі Беларусі, расстаўлены акцэнты і сказана аб тым, што быў генацыд.

Міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ адзначыў, што тэма гістарычнай памяці пакуль не дастаткова прысутнічае ў інфармацыйнай прасторы.

— Для маладзейшага пакалення ўласцівыя новыя формы камунікацыі: інтэрнэт, сацыяльныя сеткі, месенджары, дзе мы, шчыра кажучы, недапрацоўваем. Гэта тыя самыя гульнявыя формы — кіно, камп'ютарныя гульні, у якіх амерыканец ратуе ўвесь свет, а савецкі салдат ці не прысутнічае наогул, ці прысутнічае на нейкіх другарадных, часам нават вельмі камічных ролях.

Старэйшае пакаленне карыстаецца традыцыйнымі медыя — тэлебачаннем, радыё, газетамі, але і там, як канстатавалі міністр, звяртаемся да тэмы Вялікай Айчыннай вайны толькі па каляндарных датах.

— Мы маем тое, што маем, на жаль. Мы своечасова спахапіліся, таму што тыя працэсы, якія запусцілі нашы ідэалагічныя апаненты, прывялі як мінімум да рэваншысцкіх настрояў у краінах калектыўнага Захаду, да адкрытай дэманстрацыі фашысцкіх сімвалаў і заклікаў у краінах, якія калісьці ўдзельнічалі ў Вялікай Перамозе. Тое, што нашы бацькі і дзяды не маглі нават сабе ўявіць у самых вар'яцкіх снах, цяпер адбываецца, — дадаў Уладзімір Пярцоў. — Мы павінны разам зрабіць усё для таго, каб наша інфармацыйная прастора была запоўнена праўдзівай інфармацыяй, якая дазволіць фарміраваць здаровае, патрыятычнае пакаленне, якое будзе сябе адчуваць спадкаемцамі народа-пераможцы.

Старшыня Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Генадзь ДАВЫДЗЬКА адзначыў, што працаваць заўсёды трэба на выніх, а дадзеная канферэнцыя — не выключэнне.

— Я дойра, мусіць, буду называць такія мерапрыемствы баявымі дзеяннямі, таму што проста так сабрацца і пагаварыць у наш час — занадта вялікая раскоша. Павінен быць вынік, павінна быць уздзеянне на нашага саперніка. З чым паразіць памяць? Цяпер памяць — цвёрдая, канкрэтная зброя. Памяць — гэта імунная сістэма. І сёння мы тут сабраліся, каб умацаваць нашу імунную сістэму, імунную сістэму нашага грамадства, каб жыць, выжыць, каб перамагчы, — падкрэсліў ён.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Тэнгіз ДУМБАДЗЭ канстатаваў: Беларусь была, ёсць і будзе той краінай, якая да гісторыі адносіцца па заслугах:

— Я другі дзень з калегамі маю зносіны, і яны бяруць з нас прыклад. Бо мы фактычна ў новай Канстытуцыі ўзаконілі тое, што ніхто не мае права мяняць гісторыю. Мы, прынамсі, на дзесяцігоддзі замацавалі, што ніхто не прыйдзе, як гэта ў суседніх краінах адбываецца, і не стане пераглядваць гісторыю, таму што яму так захацелася. Сам факт правядзення канферэнцыі яшчэ раз пра гэта сведчыць. Я адчуваю вялікі гонар за тое, каб мы захавалі яе, і магу вам мільён прыкладаў прывесці, як нашы госці да гэтага ставяцца. Бярыць з нас прыклад, і гэта гонар. І так будзе заўсёды, пакуль мы будзем працаваць, мы заўсёды будзем абараняць і адстойваць нашу гісторыю.

— Мы бачым, што краіны Захаду дзейнічаюць вельмі прафесійна і метадычна па разбурэнні нашай гісторыі. Найперш яны дзейнічаюць з пункту гледжання разбурэння сэнсаў у нашай моладзі. У нас, старэйшага пакалення, і нават пакалення 1980—1990-х гадоў Вялікая Айчынная вайна яшчэ адгукаецца праз сустрэчы і памяць аб ветэранах, праз тую гісторыю, якую нам выкладалі ў падручніках. Але зараз праз інфармацыйную прастору ідзе нівеліраванне падзвігу савецкага салдата, савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, і робіцца гэта мэтанакіравана з ужываннем добрых метадык у інфармацыйна-псіхалагічных аперацыях. Для нас цяпер важна разгледзець метады барацьбы, якія прымяняе Захад супраць нас, і выпрацаваць адпаведныя падыходы, якія б не далі магчымасці разбурацъ гісторыю, у першую чаргу ў свядомасці нашай моладзі. Мы павінны працаваць менавіта з вывамі, нашымі сімваламі, моладдзю, каб і праз 30, 50 і 100 гадоў мы сапраўды гэтак жа шанавалі і разумелі подзвіг савецкага народа і значнасць Вялікай Айчыннай вайны і Вялікай Перамогі для беларускага народа і ў прынцыпе для ўсяго савецкага народа.

Алена КРАВЕЦ.

Па сутнасці

КРАІНА ДЛЯ НАРОДА

Адкрыю сакрэт. Пісаць з асаблівай сілай патрэбна ў двух выпадках. Калі няма пра што альбо калі тэма глыбінная і вельмі важкая, а яе необходна ўціснуць у газетны артыкул, у колькасць так званых знакаў. Нібы птушку ў памяшканне. Калі птушка на волі — гэта пісьменніцтва, калі ў нейкіх межах — журналістыка.

А зараз пытанне. У чым унікальнасць мадэлі беларускай дзяржаўнасці? Не, я не пытаюся, у кім. Адказ відавочны. У чым? У якой з'яве? Я лічу, што ў адкрытасці ўлады да чалавека. Гэта зваротная сувязь. Працуе зладжана — моцная дзяржава. Калі ж не, то рыхтуйся пайсці ў тыраж гісторыі. У асяроддзі палітолагаў ёсць такое выказванне — «чорная скрыня». Гэта пра саму дзейнасць дзяржаўнага апарату. На ўваходзе — запыты грамадства, на выхадзе — рэагаванне на гэтыя патрабаванні і прапановы. Законы, новыя школы і дарогі, жыллё альбо змены ў лепшы бок у медыцыне і адукацыі. І галоўнае ж — трэба, нібы зерне ад смецця, прапановы часткі грамадства адмежаваць ад агульнага мэйнстрыму. Не атрымаецца — чакай выбуху. Таму і называюць гэты працэс «чорнай скрыняй». Што там робіцца і як рэагуюць тыя, хто павінен рэагаваць? Працэс невядомы, вынік — лёсавызначальны.

Без усіх гэтых паліталагічных тэорый малады кіраўнік суверэннай дзяржавы адразу задаў курс. Беларусь — дзяржава для народа. Не для эліт — палітычных, фінансавых, крымінальных; не для ўладальнікаў транскарпарацый. Для народа. Так званых верталётных груфаў у нас няма. Няма і казачна багатых нетрэў. Усё багацце зямлі, напэўна, трансфармавалася ў нашу працавітасць. Ну, калі сошы не лечыць. Але соль тая, згодна з легендай, ад слёз нашых продкаў. Калі не вайна, то панская пуга. Мы ж самі ніколі не былі каланізатарамі і захопнікамі, наадварот, за кошт нашай Вялікай Перамогі нашыя бізнесменчыкаў падсадзіла Еўропу на свае вечназялёныя фінансавыя кактусы. Але, здаецца, нават арашэнне крывёй чужых народаў не выратуе іх ад гібелі. Але што дарэжэй за ўсё? Справядлівасць. Вось яе і шукае заўжды беларус. Ва ўсе гістарычныя перыяды, нават у якасці юнкераў гэроіў на літаратурных старонках.

Лукашэнка абаронцамі гэтай справядлівасці вырашыў зрабіць упраўленцаў. І нават сам прыёмы правадзіў. Але ці тое рэзана Прэзідэнта — улазіць галавой у спрэчку суседзяў за кавалак зямлі. Калі на тваіх плячах цяжар і адказнасць за зямлю і людзей краіны. Таму ў дзяржаве была створана цэлая сістэма рэагавання на звароты ад нас з вамі. Трошкі біблейскіх матываў. Менавіта ўвядзенне Майсеем інстытута дзесяцініннікаў, сотнікаў і далей — гэта і ёсць сістэма работы з грамадзянамі. Такія задачы, акрамя астатніх, выконваюць і Адміністрацыя Прэзідэнта, і парламент. Ды што там выязныя прыёмы! Да Ігара Сергеенкі неаднаразова людзі са сваімі скаргамі падыходзіць нават на вуліцы. Самае частае пытанне да мяне як да журналіста: «А як трапіць на прыём да Качанавай?»

Вельмі добра, што народ верыць вышэйшай уладзе краіны — дрэнна, што такога даверу не заробілі старшыні сельвыканкамаў, кіраўнікі раёнаў. Так, яны — чыноўнікі. Але ж гэтыя людзі — землякі для тых, хто звяртаецца па дапамогу. Тут нават не закон. Тут пытанне чалавечнасці. А дзе дэпутаты? Ці памятаюць выбаршчыкі прозвішчы сваіх абраннікаў. Клішэвіч, Марзалюк, Гайдукевіч, Савіных... Ну хто адважыцца працягнуць далей спіс уладальнікаў мандата. Я, напрыклад, нават не павтаюся са сваім дэпутатам... Бо я не ведаю, як ён выглядае. Дык што там пра грамадзянскую супольнасць?

Вось таму і пішуць Прэзідэнту. Я не ведаю, як працоўны стол кіраўніка дзяржавы выстрымлівае гэтыя пуды людской незадаволенасці. Бо тыя, хто павінен рабіць як мага лепей, робіць як мага па цыркулярах.

— А можна паставіць лаву, каб зручней людзям было чакаць пошту на калёсах альбо аўталаўку?

— А вы чакайце на нагах — так карысней для арганізма!

— Калі ласка, а можна зрэзаць кусты на крутым павароце?

— Паспрабуйце павольна ездзіць альбо лепш пешшу, так карысней для арганізма.

І калі магчыма, то на любы зварот адкажуць загадзя падрыхтаваным шаблонам. Толькі прозвішча і адрас змяні. Харастко бюракратыі. І ўсё: маем не задаволенага ўладай чалавека. Нават праціўнікам дзяржавы намагацца не трэба. Таму вось у тым ліку і за гэтых «майстроў» адказваць на запыты людзей з дапамогай дзвюх камп'ютарных каманд Ctrl+Cды Ctrl+V вымушаны краіну выратоўваць Прэзідэнт.

Дарэчы, як можна растлумачыць такія паводзіны чыноўнікаў? Альбо лянота — прыкмета часу? Гатовыя нават пятую сераду ў месяцы знайсці. Ізаліць прыёмы. Палічыце, колькі за год такіх прыёмных дзён назбіраецца. Карацей — пракрасцінацыя. Альбо... Калі асабістая выгада. Ну як не дапамагчы куму ці свату. Але тут псіхалагічным тэрмінам не апраўдаешся. Тут юрыдычны. І вось неспадзяванка выходзіць. Караюць за карупцыю — Прэзідэнт вінаваты. Таму такіх асоб да ўлады дапускае? Вось кожнаму ў душу і не зазірнеш. Я нават не здзіўлюся, калі праз нейкі час тыя, хто ківаў падчас выступлення Прэзідэнта на нарадзе з упраўленцамі, апынуцца за кратамі за карупцыю.

Такая яна, наша чалавечая натура. Таму і пакрыўджаць адно аднаго можам. Псіхалогія, а можа, і адсутнасць выхавання. А калі гэта робіць чалавек улады — гэта ўжо палітычная памылка. І, дарэчы, мы ж прывыклі заўважаць дрэнпае. На гэтым і пабудавана ўся сістэма барацьбы з уладай. Ніхто не скажа пра дзясяткі кіламетраў новай трасы. Але абавязкова пакажуць хібу ў спальным раёне. Свая пешаходная дарожка ближэйшая.

Таму вельмі складаная задача ў нашых чыноўнікаў. Менавіта нашых. Іх выхоўвалі бацькі і навучалі настаўнікі. Таму тыя ж чыноўнікі — гэта адбітак грамадства ў люстэрку. Якія яны — такія і мы. І, дарэчы, ім жа тут і жыць. Таму і краіну для жыцця яны павінны будаваць нібыта асабісты дом. Памятаюсь: якога б станоўішча не дасягнулі на сваім абраным шляху, не забывайце, кім былі, што зараз і кім будзеце. У Палацы Незалежнасці шмат фатаграфій. Адна з іх адлюстроўвае сустрэчу Лукашэнкі. Палеесе, касавіца, сяляне. Сярод натоўпу людзей — бацька. Так было, ёсць і будзе, бо Беларусь — для народа.

Яўген ПУСТАВОЙ.

«ЗАРАЗ САМЫЯ СПРЫЯЛЬНЫЯ ЎМОВЫ РАЗВІЦЦЯ СЯРЭДНЯГА І МАЛОГА БІЗНЕСУ...»

Не чакаць манны нябесная

Апошнім часам Магілёўскую вобласць часта наведваюць дзелегацыі з розных рэгіёнаў Расіі, іншых дружалюбных краін. Вядуцца перагаворы, абмяркоўваюцца планы... Прадстаўнікі Магілёўшчыны таксама выязджаюць у пошуках выгадных кантрактаў. У маі афіцыйная дзелегацыя на чале з губернатарам наведала Ленінградскую вобласць, дзе прайшлі Дні Магілёўскай вобласці і быў арганізаваны бізнес-форум. Адбыліся візіты ў Новасібірскую вобласць, Хабараўскі край. Падчас знаходжання магілёўскай дзелегацыі ў Таджыкістане была адкрыта зборачная вытворчасць прадпрыемства «Магілёўліфтмаш» у горадзе Худжанд. Прадукцыя Прыдняпроўскага краю карыстаецца попытам. Па інфармацыі аблвыканкама, па выніках квартала яна экспартавалася на рынкі 78 краін свету.

